Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар
БДУКМ
_______________ А.А. Корбут
"_____" ________ 2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ ТЭАТРАЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ**

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

Мінск 2015

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І.А. Алексніна*, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.С. Бохан,* прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*Т.М. Бабіч,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 6 ад 26.01.2015 г.);

Саветам факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 8 ад 23.03. 2015 г.);

прэзідыўмам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № ___ ад _____ ______ 2015 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма да дзяржаўнага экзамену “Тэорыя і гісторыя тэатральнай творчасці” прызначаецца для студэнтаў дзённай і завочнай формаў атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-18 01 01 “Народная творчасць” (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-03 “Народная творчасць” (тэатральная) і ахоплівае комплекс пытанняў, неабходных для якаснай прафесійнай падрыхтоўкі рэжысёраў, арганізатараў тэатральнай дзейнасці, выкладчыкаў тэатральных дысцыплін.

На працягу ўсяго перыяду навучання будучыя рэжысёры атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па шэрагу гуманітарных, агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, у тым ліку “Рэжысура”, “Тэорыя і гісторыя рэжысуры”, “Гісторыя мастацваў: тэатральнае”. Гэты дысцыпліны не толькі дапамагаюць фарміраванню тэарэтычнага і творчага мыслення студэнта, але і дазваляюць разглядаць тэатральнае мастацтва нашай краіны ў цеснай сувязі ўсіх яго кампанентаў, спрыяюць узбагачэнню светапогляду кожнага з навучэнцаў.

Выхаванне рэжысёраў-выкладчыкаў на кафедры тэатральнай творчасці грунтуецца на дасягненнях сучаснага беларускага тэатральнага мастацтва, у аснове якога ляжыць рэалістычны, блізкі да псіхалагічнага, тэатр, “сістэма” і “этыка” К.С. Станіслаўскага, вопыт у галіне засваення “эпічнага тэатра” Бертольда Брэхта, эксперыментальныя распрацоўкі ў галіне заходнееўрапейскага тэатральнага мастацтва Джорджо Стэлера, Пітэра Брука, Ежы Гратоўскага і іншых дзеячаў заходнееўрапейскіх краін.

Краевугольным каменем падрыхтоўкі рэжысёраў рэалістычнай школы з’яўляецца “сістэма” Станіслаўскага, асноўная мэта якой раскрыццё і гарманічнае развіццё творчай прыроды творцы спектакля і ролі, арганічная сувязь і ўзаемадзеянне рэжысёрскага мастацтва і акцёрскага майстэрства. Таму вельмі важна для будучых рэжысёраў не толькі зразумець вучэнне аб дзеянні і звышзадачы, але і навучыцца  практычна іх выкарыстоўваць ў працэсе работы над сваім дыпломным спектаклем.

Нельга абыйсці ўвагай і значнасць авалодання студэнтамі-выпускнікамі кафедры тэатральнай творчасці ўсім комплесам уменняў і навыкаў, неабходных для пабудовы спектакля (ад першай чыткі да прэм’ернага паказу), як і патрэбнасць развіцця здольнасці да вобразнага рэжысёрскага бачання будучай пастаноўкі ў цэлым і ўменне выражаць асабістае  бачанне ў дзеянні, мізансцэнах і іншых элементах сцэнічнай формы. Засваенне тэарэтычных ведаў у працэсе падрыхтоўкі спецыяліста на працягу ўсяго перыяду навучання непарыўна звязана з пераатварэннем тэорыі ў практыку ад першага прачытання п’есы да фарміравання рэжысёрскай задумы спектакля, стварэння пастановачнага плана, арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу і да стварэння візуальнага вобраза спектакля і яго музычна-шумавога вырашэння.

***Мэта правядзення дзяржаўнага экзамену па “Тэорыі і гісторыі тэатральнай творчасці”*** – выявіць узровень тэарэтычных ведаў выпускніка кафедры тэатральнай творчасці па тэорыі і гісторыі тэатральнай творчасці, яго падрыхтаванасць да далейшай працы ў якасці арганізатара тэатральнай дзейнасці, выкладчыка і рэжысёра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма структурыруецца ў адпаведнасці з ўзаемаабумоўленнымі аспектамі гісторыі і тэорыі тэатральнага мастацтва. Першы яе раздзел прысвечаны гісторыі тэатральнай творчасці, другі – тэорыі тэатральнай творчасці. Трэба адзначыць, што па прычыне велізарнага аб'ёма інфармацыі (асабліва па гісторыі заходнееўрапейскага і рускага тэатральнага мастацтва) праграма ахоплівае толькі некаторыя, найбольш значныя для станаўлення і сучаснага развіцця тэатральнага мастацтва Беларусі (на думку складальніка праграмы), пытанні.

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў вуснай форме па білетах, якія ўтрымліваюць два пытанні. Першае пытанне тычыцца гісторыі замежнага, рускага або беларускага тэатральнага мастацтва. Другое тычыцца тэарэтыка-практычнага аспекта работы рэжысёра над стварэннем рэжысёрскай задумы і пастаноўкай спектакля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## **Раздзел I** ГІСТОРЫЯ ТЭАТРАЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ

### I.1 Заходнееўрапейскае тэатральнае мастацтва

*Старажытнагрэчаская драматургія і тэатр*

Паходжанне старажытнагрэчаскай драматургіі і тэатра. Міф як аснова старажытнагрэчаскай трагедыі. Першае драматычнае прадстаўленне. Жанры старажытнагрэчаскай драматургіі. Трагедыі Эсхіла, Сафокла і Эўрыпіда. Старажытнагрэчаская камедыя. Творчасць камедыёграфа Арыстафана.

Архітэктура, тэатральная машынэрыя, дэкарацыі, маскі і касцюмы старажытнагрэчаскай трагедыі. Асаблівасці тэатральных прадстаўленняў у старажытнагрэчаскім тэатры. Тэатр і глядач.

Асаблівасці тэатра эпохі элінізму. Новаатычная камедыя. Творчасць Менандра.

"Нізавыя" (народныя) відовішчныя формы тэатральнай творчасці ў Афінах эпохі элінізму (мім, пантаміма, фліакі).

*Італьянская народная камедыя масак "дэль артэ"*

Прырода і паходжанне дэль артэ. Дзеючыя асобы камедыі. Прынцыпы падзелу персанажаў-масак. Асаблівасці прадстаўленняў дэль артэ. Мова персанажаў. Касцюм і маска. Пластычнае і музычнае вырашэнне спектакляў. Дэкарацыі і касцюмы. Буфанаднасць і дынаміка развіцця дзеяння. Лацы ў структуры камедыі. Крыніцы для стварэння сцэнарыяў камедыі. Асноўная фабула паказаў дэль артэ. Шматварыянтнасць сцэнарыяў. Папулярнасць камедыі ў Італіі і за яе межамі.

Камедыя дэль артэ на Беларусі. Блізасць фабульнай асновы драматургіі Уршулі Радзівіл да дэль артэ. Прыклады.

Беларуская народная драма і камедыя дэль артэ: агульнае і асаблівае. Уплыў італьянскай народнай камедыі масак на далейшае развіццё тэатральнага мастацтва і творчую дзейнасць славутых рэжысёраў свету XX стагоддзя.

*Драматургія і творчая дзейнасць У. Шэкспіра*

Біяграфічныя звесткі аб У. Шэкспіры. Яго "датэатральныя" заняткі. Пачатак акцёрскай кар'еры. Праца ў трупе Бёрбіджаў і тэатрах "Глобус" і "Блэкфраерс". Ролі Шэспіра. Пачатак кар'еры драматурга. Прынцыпы і падыходы да сістэматызацыі творчасці Шэкспіра. Тэатр "Глобус". Архітэктура, прынцыпы акцёрскай ігры і дэкарацыйнага вырашэння спектакляў у часы Шэкспіра. Шэкспір на беларускай сцэне: гісторыя і сучаснасць. Сусветнавядовыя пастаноўкі драматургіі Шэкспіра.

*Драматургія і творчая дзейнасць Ж.-Б. Мальера*

Пачатак творчай дзейнасці. Правал "Бліскучага тэатра". Гастролі па правінцыі і іх роля ў станаўленні Мальера-драматурга. Вяртанне трупы Мальера ў Парыж. Дзейнасць трупы Мальера ў палацы Пале-Раяль. Камедыйная творчасць Мальера. Апошні перыяд яго творчай дзейнасці. Адкрыццё тэатра "Камедзі Франсэз".

Роля творчасці Жана-Баціста ў гісторыі сусветнага тэатральнага мастацтва. Спектаклі Ж.-Б. Мальера на беларускай сцэне.

*Творчая дзейнасць Л. Кронэка*

Пачатак творчай дзейнасці ў Берліне. Праца на сцене Цюрыха, Лейпцыга. Прызначэнне галоўным рэжысёрам, дырэктарам і кіраўніком Мейнінгенскага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працяг традыцый рэжысуры Э.Кінга, Л.Дзеўрыента. Асноўныя прынцыпы дзейнасці Мейнінгенскага тэатра пад кіраўніцтвам Л. Кронэка. Пастаноўкі класікі і сучасных аўтараў на сцэне Мейнінгенскага тэатра. Наватарства ў рэжысуры Л.Кронэка. Гастрольная дзейнасць тэатра і яго ўплыў на заходнееўрапейскі і рускі тэатр таго часу.

*Творчая дзейнасць А. Антуана*

Пачатак творчага шляху. Стварэнне "Свабоднага тэатра" у Парыжы. Адкрыццё тэатра Антуана і праца ў тэатры "Адэон". Выступленні з лекцыямі ў абарону ідэй "школы натуралізма" Э. Заля. Пастаноўкі Антуанам твораў драматургаў-сучаснікаў.

Погляды А. Антуана на сучасную падрыхтоўку акцёраў. Акцёрскія работы Антуана. Яго наватарства ў рэжысёрскай творчасці. "Дзённік дырэктара тэатра" як каштоўнейшы дакумент аб жыцці французскага тэатра канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Праца Антуана ў кіно.

Гастролі тэатра А. Антуана па краінах Еўропы і Расіі. Уплыў творчасці рэжысёра на тэатральнае мастацтва Еўропы і Расіі I паловы XX стагоддзя.

*Творчая дзейнасць О. Брама*

Вучоба ў Берлінскім, Гейдэльбергскім і Страстбургскім універсітэтах. Праца ў якасці літаратурнага і тэатральнага крытыка. Заснаванне "Свабоднага тэатра" у Берліне. Выступленні тэатра на розных нямецкіх пляцоўках. Пастаноўкі Брамам твораў айчыных і замежных сучаснікаў.

Рэфарматарская дзейнасць О. Брама ў галіне тэатральнага мастацтва. Часопіс "Свабодны тэатр" як прапаведнік ідэй натуралізму і рэалізму. Спектакль "Ткачы" Г. Гауптмана ў "Свабодным тэатры" О. Брама. Стварэнне Брамам і аднадумцамі "Нямецкага тэатра". Праца Брама ў "Лессінг-тэатры". Пастаноўкі там п'ес Г. Ібсэна, Г. Гауптмана, Г. фон Гофманстала і М. Мэтэрлінка. Уплыў творчасці О. Брама на далейшыя шляхі развіцця заходнееўрапейскага тэатра і рэжысёрскае мастацтва.

*Творчая дзейнасць М. Рэйхгардта*

Работа ў якасці акцёра ў тэатрах Братыславы, Зальцбурга, "Нямецкага тэатра". Ролі Рэйнхгардта. Пастаноўка сатырычных сцэнак і пародый на сцэне артыстычнага тэатра-кабарэ "Шум і дым", стварэнне "Малога тэатра". Пастаноўка спектакля "Начлежка" па п'есе М. Горкага "На дне".

Тэндэнцыі сцэнічнага рэалізму ў пастаноўках М. Рэйхгардта. Стварэнне "Новага тэатра". Спектаклі па творах Г.-Э. Лессінга, Ф. Шылера, Л. Талстога, У. Шэкспіра, сімвалістаў і мадэрністаў.

Кіраўніцтва "Нямецкім тэатрам". Паралельная праца ў "Камершпіле" і пастаноўкі сучаснай драматургіі. Класіка ў пастаноўцы Рэйхгардта на сцэне берлінскага "Нямецкага тэатра". Адкрыццё драматычнай школы. Кіраўніцтва тэатрам "Фальксбюнэ" і "Гроссэ шаўшпільхауз" (Берлін). Адкрыццё тэатра "Камедыя". Кіраўніцтва "Іозеф – штадттэатрам". Спектаклі М. Рэйнхардта паводле шэкспіраўскіх п'ес.

Работа з маладымі акцёрамі. Вучні Рэйхардта.

Рэжысёрскае наватарства Рэйгардта. Пастаноўка твораў Г. Гётэ, Ленца, Г. Бюхнэра. Цікавасць рэжысёра да твораў сучасных нямецкіх драматургаў, рускай класікі, антычнай драматургіі і буйнейшых драматургаў замежжа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца Рэйнхардта над увасабленнем ідэй сінтэтычнага тэатра. Тэатральныя эксперыменты Рэйгардта. Гастролі па краінах Заходняй Еўропы і ЗША. Пастаноўкі спектакляў у іншых краінах свету. Адкрыццё першай у Заходняй Еўропе школы для рэжысёраў і заснаванне тэатральнай школы ў Галівудзе і здымкі некалькі фільмаў. Прысваенне "Нямецкаму тэатру" імя стваральніка.

Праца Рэйнгардта ў кіно.

Уплыў творчай дзейнасці М. Рэйнгардта на сусветнае тэатральнае мастацтва.

*Творчая дзейнасць Э.- Г. Крэга*

Ролі на сцэне тэатра "Ліцэўм". "Англійскі перыяд" творчасці Крэга як пачатак пошуку новых форм вырашэння сцэнічнай прасторы. Наватарства гэтых пастановак. Уплыў танцавальнага майстэрства А. Дункан на вырашэнне сцэнічнай пляцоўкі Крэга. Тры асноўныя кампаненты тэорыі Крэга.

Супрацоўніцтва з А. Апіа ў напрамку рэканструкцыі сцэнаграфіі тэатра.

"Фларэнційскі перыяд" творчасці: артыкулы аб тэатры "Артысты тэатра будучага" і "Акцёр і звышмарыянетка". Спектаклі ў Лондане, Парыжы, Маскве. "Гамлет" у Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры. Іншыя работы гэтага перыяду.

Тэарэтычныя работы Крэга. Выдавецтва часопісаў "Пэйдж", "Маска" і "Марыянетка". Работы Крэга – мастака-ілюстратара і гравёра да шэрагу кніг. Уплыў ідэй "ідэальнага тэатра" Г. Крэга на развіццё тэатральнага мастацтва свету.

*Творчая дзейнасць драматурга*
*і заснавальніка "эпічнага" тэатра Б. Брэхта*

Станаўленне Б. Брэхта як акцёра, рэжысёра і драматурга. Зараджэнне тэорыі "эпічнага" тэатра. Погляды Брэхта на тэатральнае мастацтва і іх адлюстраванне ў п'есах і прадмовах да іх. Драматургія Б. Брэхта. Практычнае ўвасабленне тэорыі драматурга ў дзейнасці тэатра "Берлінер-Ансамбль". Рэпертуар тэатра. Вядучыя акцёры тэатра. Гастролі тэатра ў СССР ў 1960-я гг. ХХ стагоддзя.

Вытокі і прынцыпы "эпічнага" тэатра Брэхта. Сутнасць паняццяў "ачужэнне" і "астранене". Брэхтаўскія "зонгі".

Уплыў творчасці Б. Брэхта на сусветны і беларускі тэатр. Пастаноўкі твораў Б. Брэхта на беларускай сцэне.

*Творчая дзейнасць П. Брука*

Вучоба ў Оксфардскім універсітэце. Рэжысёрскі дэбют і раннія спектаклі Брука. Лепшыя спектаклі рэжысёра паводле твораў У. Шэкспіра.

Зварот да прынцыпаў тэатра "жорсткасці" А. Арто. Оперныя і драматычныя спектаклі Брука. Арганізацыя "Міжнароднай тэатральнай трупы" і адкрыццё "Міжнароднага цэнтра тэатральных даследаванняў". Эксперыментальная работа Цэнтра ў Іране і ўдзел у Пятым фестывалі мастацтваў Ірана. Вандроўкі па Афрыцы. Спектаклі рэжысёра "афрыканскага" перыяду. Удзел Брука ў Міжнародным тэатральным фестывалі імя А. Чэхава (Масква).

Кінапрацы П. Брука.

Работы Брука па тэорыі тэатральнага мастацтва: "Пустая прастора", «Блукаючая кропка», «Сакрэтаў няма. Думкі аб акцёрскім мастацтве і тэатры», «Ніці часу».

Уплыў творчасці Брука на сусветны тэатр.

*Творчая дзейнасць Дж. Стэлера*

Вучоба ў акадэміі аматараў тэатральнага мастацтва і пастаноўка першага спектакля ва ўніверсітэцкім тэатры г. Навары. Стварэнне акцёрскай трупы ў Жэневе і пастаноўка першых спектакляў. Адкрыццё першага стацыянарнага тэатра “Пікала тэатра дзі Мілано”.

Уплыў творчасці Ж. Капо, Л. Жувэ і Б. Брэхта на творчы светапогляд Стрэлера. Акцёрскія работы і спектаклі рэжысёра паводле сучаснай італьянскай драматургіі.

Ідэя тэатра як культурнага цэнтра, з бібліятэкай, музеем, канферэнц-залай, магазінам з кнігамі і пласцінкамі, камернай сцэнай для эксперыментальных спектакляў. Заснаванне пры “Пікала-тэатры” студыі.

Дзейнасць Стрэлера ў шасцідзесятыя-сямідзесятыя гады дваццатага стагоддзя. Творчасць гэтага перыяду. Узначальванне “Тэатра Еўропы”. Педагагічная дзейнасць Стрэлера ў драматычнай школе.

Манаграфія Стрэлера “Тэатр для людзей”. Уплыў творчасці Дж. Стрэлера на развіццё сусветнага тэатра.

*Творчая дзейнасць Е.-М. Гратоўскага*

Вучоба ў Польшчы і стажыроўка ў Расіі. Дэбют у Кракаве і першыя рэжысёрскія работы.

Стварэнне тэатра-студыі “13 радоў” (з 1962 г. – Тэатр-лабараторыя). Спектаклі Гратоўскага гэтага перыяду. Пераезд у Вроцлаў і ўвасабленне тэорыі «беднага тэатра». Наватарства ў рэжысуры Гратоўскага. Акцёры і спектаклі тэатра-лабараторыі гэтага перыяду.

Паратэатр Гратоўскага і яго праекты ў 1960-1970-я гг. Праца Універсітэта пошукаў (Вроцлаў) падчас гастроляў Міжнароднага тэатра нацый.

Дзейнасць Е. Гратоўскага у 1970-1980-я гг. Тэатральныя эксперыменты рэжысёра ў м. Бжэзінец, у краінах Еўропы, Азіі, Паўночнай і Лацінскай Амерыкі, Аўстраліі. Спыненне дзейнасці творчай лабараторыі і заснаванне “Цэнтра работ Ежы Гратоўскага” у Італіі.

Выданне ў Даніі кнігі Е. Гратоўскага “На шляху да беднага тэатра” з прадмовай П. Брука. Артыкулы Гратоўскага па праблемах тэатральнага мастацтва. Уплыў эксперыментальнай творчасці Е. Гратоўскага на сусветны, у тым ліку, беларускі тэатр.

## І.2 Расійскае тэатральнае мастацтва

*Творчая дзейнасць К.С. Станіслаўскага*

Пачатак тэатральнай дзейнасці. Заснаванне МХТ (Маскоўскі Мастацкі тэатр) (сумесна з Ул.І. Неміровічам-Данчанка). Спектаклі ранняга перыяду дзейнасці МХТ. Пошукі на шляху дасягнення “сцэнічнага рэалізма”. Адметнасць спектакляў МХТ у рэжысуры К.С. Станіслаўскага. Работы Станіслаўскага-рэжысёра ў 1920-1930-я гг. Наватарства рэжысуры К.Станіслаўскага. Станіслаўскі-акцёр. Выкладанне ў драматычных і оперных студыях. Зараджэнне і развіццё “сістэмы” і “этыкі” Станіслаўскага. Распрацоўка К. Станіслаўскім метада работы з акцёрам і пьесай. Пошукі новых шляхоў у сцэнічным мастацтве.

Уплыў творчай дзейнасці К.С. Станіслаўскага на сусветны тэатр. Выкарыстанне прынцыпаў жыццёвай праўды і сцэнічнага рэалізму ў работах вядучых беларускіх акцёраў (Г. Глебаў, У. Дзядзюшка, І. Ждановіч, А. Ільінскі, П.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Малчанаў, Б. Платонаў, Л. Рахленка, Л. Ржэцкая, Ф. Шмакава і інш.) спектаклях Ф. Ждановіча, М. Міцкевіча, І. Папова, К. Саннікава і інш).

*Творчая дзейнасць Ул.І. Неміровіча-Данчанкі*

Навучанне ў Тыфліскай гімназіі і Маскоўскім універсітэце. Праца тэатральным крытыкам. Першыя спробы драматургіі. Выкладчыцкая дзейнасць ў Музычна-драматычным вучылішчы Маскоўскага філарманічнага грамадства. Вучні Неміровіча-Данчанкі.

Заснаванне МХТ (сумесна з К.С. Станіслаўскім). Стварэнне Музычнай студыі пры МХАТ. Гастролі студыі за мяжой. Праца ў Галівудзе. Ажыццяўненне кіраўніцтвам МХАТ пасля 1928 г.

Уклад Неміровіча-Данчанкі ў адкрыццё сучаных драматургаў. Яго спекталі на сцэне МХАТ. Ініцыіраванне стварэння Школы-студыі МХАТ.

Уплыў творчай спадчыны Ул.І. Неміровіча-Данчанкі на развіццё сусветнага тэатра.

*Творчая дзейнасць Я. Б. Вахтангава*

Удзел у аматарскіх тэатральных гуртках. Вучоба ў Маскоўскім універсітэце і тэатральнай школе А.І. Адашава. Фарміраванне акцёрскага майстэрства. Праца Я. Вахтангава ў МХТ у якасці акцёра. Удзел у працы Першай студыі МХТ. Акцёрскія і рэжысёрскія работы Вахтангава дакастрычніцкага перыяду. Стварэнне студэнцкай драматычнай студыі. Пастаноўка спектакля “Цуд святога Антонія” М. Метэрлінка.

Лепшыя работы Вахтангава-рэжысёра. Наватарства формы сцэнічнага ўвасаблення спектаклей. Вахтангаў-педагог. Стварэнне тэатра імя Я.Б. Вахтангава. Уплыў дзейнасці Я.Б. Вахтангава на развіццё рускага і беларускага тэатра.

*Творчая дзейнасць Ус.Э. Меерхольда*

Вучоба ў Музычна-драматычным вучылішчы Маскоўскага філарманічнага таварыства. Ролі ў МХТ і Таварыстве новай драмы. Кіраўніцтва Таварыствам новай драмы ў правінцыі (Херсон, Тыфліс, Нікалаеў, Палтава); пастаноўка твораў класікаў і сучаснікаў. Падрыхтоўка рэпертуару і адкрыццё тэатра-студыі пры МХТ. Праца ў тэатры В.Ф. Камісаржэўскай. Спектаклі па п’есах Г. Ібсена, М. Метэрлінка, А. Блока, Л. Андрэева і інш. Спектаклі Меерхольда гэтага перыяду ў Александрынскім тэатры. Пастаноўка опер у Марыінінскім тэатры. Эксперыментальныя і сімвалічныя спектаклі Меерхольда па творах П. Кальдэрона, О. Уайльда, Ю.-А. Стрындберга, Гі дэ Мопасана, А. Блока, У. Маякоўскага і шэрагу пантамім.

Адкрыццё тэатра імя У.Э. Меерхольда і спектаклі гэтага перыяду. Закрыццё тэатра. Праца рэжысёра ў іншых тэатрах. Пастаноўка радыёспектакляў. Узначальванне Дзяржаўнага опернага тэатра імя К.С. Станіслаўскага.

Кінапрацы Меерхольда. Меерхольд-педагог. “Біямеханіка”: агульнае і супрацьлеглае з “сістэмай” Станіслаўскага. Адкрыццё Дзяржаўных вышэйшых рэжысёрскіх курсаў (майстэрняў). Педагагічныя ідэі рэжысёра. Меерхольд-перакладчык і рэдактар.

Уплыў тэарэтычных поглядаў і практычных пошукаў Меерхольда на тэатральнае мастацтва Расіі і Беларусі.

*Творчая дзейнасць Г.А. Таўстаногава*

Пачатак сцэнічнай дзейнасці ў якасці артыста і асістэнта рэжысёра ў Рускім ТЮГу (Тбілісі). Спектаклі таго перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучоба ў Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва. Праца рэжысёрам у Рускім драматычным тэатры імя А. Грыбаедава (Тбілісі). Рэжысёрскія работы гэтага перыяду. Праца ў Цэнтральным дзіцячым тэатры (Масква) і пастаноўкі ў іншых тэатрах.

Узначальванне Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага (Ленінград, БДТ-1) і першыя работы на сцэне БДТ-1. Узмацненне акцёрскага складу трупы. Лепшыя работы тэатра. Праца Таўстаногава ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка за мяжой (Германія, Фінляндыя, Балгарыя, Польшча і інш.), на рускім радыё і тэлебачанні.

Шматгадовая праца Таўстаногава ў Ленінградскім дзяржаўным інстытуце тэатра і кіно (сёння – Санкт-Пецярбурская акадэмія тэатральнага мастацтва) і метадалогія выкладання рэжысуры. Вучні Г.А. Таўстаногава. Працы Таўстаногава па гісторыі і тэорыі тэатральнага мастацтва. Уплыў яго творчай дзейнасці на тэатральнае мастацтва Расіі і Беларусі.

*Творчая дзейнасць Ю.П. Любімава*

Паступленне ў Студыю МХАТ-2 і акцёрскі дэбют ў спектаклі "Мальба аб жыцці" Дзюваля. Вучоба ў тэатральным вучылішчы пры тэатры імя Я. Вахтангава. Праца артыстам Ансамбля песні і пляскі НКВД. Ролі Любімава ў час працы ў Тэатры імя Я. Вахтангава. Рэжысёрскі дэбют на сцэне тэатра Вахтангава са спектаклем "Ці многа патрэбна чалавеку" А. Галіча. Наведванне семінараў акцёра і рэжысёра М. Кедрава, вучоба ў Тэатральным вучылішчы імя Б. Шчукіна.

Адкрыццё тэатра на Таганцы. Узначальванне тэатра і пастаноўка лепшых спектакляў. Супрацоўніцтва тэатра пад кіраўніцтвам Любімава з вядучымі паэтамі, пісьменнікамі, кампазітарамі, фізікамі сучаснасці. Кінапрацы Любімава.

Праца Любімава на іншых пляцоўках свету. Забарона спектакляў Любімава ў СССР. Пазбаўленне савецкага грамадства. Гады эміграцыі і праца на пляцоўках Аўстрыі, Англіі, ЗША, Італіі.

Вяртанне Любімава на Радзіму. Спектаклі апошняга перыяду творчасці.

*Творчая дзейнасць А.В. Эфраса*

Вучоба ў Студыі тэатра імя Массавета і Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва. Праца ў перасоўным тэтры М.В. Кнэбель, а таксама, у Разані, Цэнтральным дзіцячым тэатры (Масква). Спектаклі таго часу. Узначальванне тэатра імя Ленінскага камсамола. Спектаклі гэтага перыяду.

Праца Эфраса чарговым рэжысёрам у Маскоўскім драматычным тэатры на Малай Броннай. Спектаклі гэтага перыяду.

Узначальванне Эфрасам Маскоўскага тэатра драмы і камедыі на Таганцы. Спектаклі "таганскага" перыяду.

Кінапрацы Эфраса.

Тэарэтычная спадчына рэжысёра і педагога: "Прафесія – рэжысёр", "Рэпетыцыя – любоў мая", "Працяг тэатральнага рамана" і "Кніга чацвёртая".

Уплыў творчасці Эфраса на сучасны тэатр і тэатральную педагогіку Расіі і Беларусі.

*Творчая дзейнасць П. Фаменка*

Вучоба ў Музычна-педагагічным інстытуце імя Гнесіных, вучылішчы імя М.М. Іпалітава-Іванова. Паступленне ў Школу-студыю МХТ. Адлічэнне. Вучоба на філалагічным факультэце МГПІ імя У. Леніна і ГІТІСе. Пастаноўкі Фаменка ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатрах імя У. Маякоўскага, Ленсавета, Тбіліскім тэатры імя А. Грыбаедава. Праца ў Ленінградскім тэатры камедыі. Вяртанне ў Маскву. Праца ў тэатры імя У. Маякоўскага і Я.Б. Вахтангава. Педагагічная дзейнасць ў ГІТІСе. Выкладанне ў Парыжскай кансерваторыі. Пастаноўка спектакля ў Камедзі Франсез. Адмова ад выкладання ў РАТІ (ГІТІС). Вучні П. Фаменка.

*Творчая дзейнасць М.А. Захарава*

Паступленне на акцёрскі факультэт ГІТІСа. Пачатак прафесійнай дзейнасці на сцэнах тэатраў імя У. Маякоўскага і М. Ярмолавай.

Праца Захарава ў Пермскім абласным драматычным тэатры і рэжысёрскі дэбют у спектаклі “Арыстакраты” М. Пагодзіна. Рэжысёрскі поспех Захарава на сцэне тэатра Сатыры. Узначальванне Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола (пазней – “Ленком”). Спектаклі “ленкомаўскага” перыяду. Паспяховыя гастролі тэатра пад кіраўніцтвам Захарава ў Парыж, Германію, Нідзерланды, Грэцыю, ЗША. Кінапрацы Захарава.

Выкладанне Захаравым рэжысуры ў Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва. Сумяшчэнне выканання абавязкаў прафесара кафедры рэжысуры Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва з пасадамі Сакратара Саюза тэатральных дзеячаў, акадэміка Акадэміі расійскага тэлебачання, акадэміка Міжнароднай акадэміі творчасці і члена Саюза пісьменнікаў г. Масквы.

Работы Захарава аб тэатральным мастацтве і прафесійнай дзейнасці /“Кантакты на розных узроўнях”, “Суперпрафесія”/.

Уплыў творчай дзейнасці Захарава на рускі і беларускі тэатр.

*Творчая дзейнасць Л. Додзіна*

Заняткі ў Ленінградскім тэатры юнацкай творчасці. Вучоба ў Ленінградскім інстытуце тэатра, музыкі і кінематаграфіі. Дэбют тэлеспектаклем “Першае каханне”. Праца ў Ленінградскім ТЮГу. Выкладанне акцёрскага майстэрства і рэжысуры ў ЛГІТМіКу. Праца ў Тэатры драмы і камедыі на Ліцейным. Спектаклі Додзіна на Малай сцэне БДТ і МХАТ. Праца ў Малым Драматычным тэатры. Узначальванне Тэатра Еўропы. Спектаклі Л. Додзіна сучаснага перыяду.

## І.3 Тэатральная творчаць беларускага народа: ад вытокаў да сучаснасці

*Вытокі беларускага тэатра*

Першааснова беларускага тэатра: народныя гульні, абрады, ігрышчы. Элементы тэатралізацыі ў сямейна-абрадавай (хрэсьбіны, вяселле, пахаванне, святкаванне Каляд, Купалле і інш.) і пазаабрадавай творчасці народа (карагоды і гульні “Жаніцьба Яшчара”, “Жаніцьба Цярэшкі”). Выкарыстанне песень, танцаў, карагодаў. Вылучэнне з агульнай масы ўдзельнікаў асобных выканаўцаў, пераапрананне і пераўвасабленне ў іншыя істоты (антрапаморфныя і заапаморфныя). Паступовае выдзяленне самастойных драматычных сцэн з грунтоўнай распрацоўкай характараў дзеючых асоб. З’яўленне першых прафесійных акцёраў – скамарохаў на Беларускіх землях.

*Скамарохі на Беларусі*

Сувязь скамароства і язычніцтва. З’яўленне скамарохаў на беларускіх землях (XII ст.). Вандроўныя і аседлыя скамарохі. Сінтэтычны характар прадстаўленняў скамарохаў. Зараджэнне і ўдасканаленне прафесій музыканта, мядзведніка, бахара, штукара, лялечніка і інш. Рэпертуар тэатра скамарохаў (сцэны “Мацей і доктар”,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калядоўшчыкі з казой, апавяданні, песні і інш.). “Смаргонская акадэмія” і яе роля ў росквіце майстэрства дрэсуры. Позняе (у параўнанні з рускімі землямі) бытаванне скамарошскіх традыцый на Беларусі (да пачатку XX ст.).

Уплыў традыцый скамароства на фарміраванне і развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі.

*Беларуская народная драма*

Вызначэнне паняцця “народная драма”. Вытокі народнай драмы на Беларусі. Падзел на вялікія формы, малыя гумарыстычныя сцэнкі і інтэрмедыі. Наяўнасць у народных драмах дзвух ліній: “сур’ёзнай” і “жартоўнай. Дзеючыя асобы народных драм. Падрыхтоўка выканаўцаў народных драм. Асаблівасці прадстаўленняў народнай драмы. Узаемадзеянне з гледачом. Дэкарацыі і рэквізіт. Роля скамарохаў у распаўсюджванні народнай драмы.

Уплыў народных драм на развіццё беларускай драматургіі і тэатра.

*Беларускі лялечны тэатр тыпу “батлейка”*

Вытокі лялечнага тэатра гэтага тыпу. Паходжанне назвы. Разнавіднасці батлейкі. Батлейка ў іншых краінах. Вылучэнне лялечнага тэатра батлейка (канец XVI ст.) у асобны від тэатральнага мастацтва. Найбольш вядомыя беларускія батлеечнікі.

Рэпертуар лялечнага тэатра тыпу “батлейка”. Сюжэты батлеечных спектакляў. Найбольш пашыраныя ў розных паказах сцэны. Дзеючыя асобы батлеечных прадстаўленняў. Лялькі і канструкцыі батлейкі. Характар прадстаўленняў. Асаблівасці музычнага і сцэнаграфічнага вырашэння батлеечных спектакляў.

Уплыў тэатра тыпу “батлейка” на фарміраванне і развіццё беларускай драматургіі і тэатра.

*Прыватна-уласніцкі тэатр*

Узнікненне ў сярэдзіне XVIII стагоддзя новага віду тэатральнага мастацтва. Тэатры Ф.-У. Радзівіл у Нясвіжы (з 1740; камедыі, драмы, оперныя пастаноўкі); А. Тызенгаўза ў Гродна (з 1760; балетныя спектаклі); “сядзіба музаў” М. Каз. Агінскага ў Слоніме (1770-1790-я гг.; оперныя і балетныя прадстаўленні); С. Зорыча ў Шклове (1778 – 1800; балетныя і драматычныя пастаноўкі), а таксама тэатры Сапегаў у Ружанах, Тышкевічаў у Свіслачы, Чарнышова ў Магілёве. Роля прыватнаўласніцкіх тэатраў у развіцці прафесійнага тэатральнага мастацтва на Беларусі.

*Драматургія і тэатральная дзейнасць В.І. Дуніна-Марцінкевіча*

Вучоба ў Бабруйскім павятовым вучылішчы і Пецярбургу. Праца ў епархіяльнай кансісторыі і крымінальным судзе ў Мінску. Удзел у паўстанні 1863-1864 гг. Зняволенне ў Мінскім астрозе. Жыццё ў Люцынцы пад наглядам паліцыі. Драматургічная творчасць.

Першая спроба стварэння нацыянальнага прафесійнага тэатра на Беларусі пад ўплывам традыцый рускага і польскага прафесійнага тэатра. Склад сямейнага тэатра Дуніна-Марцінкевіча. Сінтэтычнасць спектакляў тэатра Дуніна-Марцінкевіча. Акцёрскія работы Вінцэнта Іванавіча. Рэпертуар тэатра. Паказы ў Мінску, Глуску, Слуцку, Бабруйску і інш. Спектаклі ў мясцовай школе. Забароны пастановак.

Роля драматургіі і тэатральнай дзейнасці Дуніна-Марцінкевіча ў далейшым развіцці нацыянальнага прафесіянальнага тэатральнага мастацтва Беларусі. Развіццё тэатральных традыцый В. Дуніна-Марцінкевіча ў беларускім нацыянальным тэатры пачатку XX ст. Прысваенне імя Дуніна-Марцінкевіча Магілёўскаму абласному

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычнаму тэатру драмы і камеды ў Бабруйску. Сучасныя пастаноўкі паводле яго драматургіі на беларускай сцэне.

*Творчая дзейнасць Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам І.Ц. Буйніцкага*

Вучоба ў Рыжскім землямерным вучылішчы і прыватнай драматычнай студыі ў Вільні. Праца каморнікам і "беларускія вечарынкі". Стварэнне Першай беларускай трупы пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага. Цікавасць да нацыянальнай культуры і выкарыстанне народных песен, танцаў, традыцый, строяў у творчасці яго трупы. Сувязь спектакляў трупы Буйніцкага з "беларускімі вечарынкамі". Рэпертуар тэатра. Сінтэтычны характар прадстаўленняў трупы. Асаблівасць тэатральных пастановак Першай беларускай трупы. Склад трупы. Роля А. Бурбіса ў дзейнасці трупы Буйніцкага.

Акцёрскія работы І. Буйніцкага. Удзел у працы трупы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Гастрольная дзейнаць трупы. Закрыццё тэатра. Ініцыіраванне Буйніцкім стварэння Першага таварыства беларускай драмы і камедыі.

Уплыў творчасці Буйніцкага на далейшае развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі.

*Творчая дзейнасць Першага таварыства беларускай драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Ф.П. Ждановіча*

Вучоба. Працяг у пастаноўках Ждановіча традыцый тэатра І. Буйніцкага. Заснаванне Першага таварыства беларускай драмы і камедыі" на аснове клуба мінскай інтэлігенцыі "Беларуская хатка" (у 1918-1919 гг. – Беларускага савецкага тэатра) на чале з Ф. Ждановічам.

Пастаноўкі Ждановіча ў Таварыстве. Гастролі Таварыства па Беларусі. Адкрыццё ў Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра (1920, БДТ-1, на базе Таварыства, з 1944 г. – Беларускі тэатр імя Я. Купалы).

Мастацкае кіраўніцтва Ф. Ждановічам трупай БДТ-1. Перанос на сцэну БДТ-1 спектакляў Таварыства. Акцёрскія работы Ф. Ждановіча на сцэне БДТ-1 у дваццатыя гады дваццатага стагоддзя. Рэпрэсіраванне акцёра і рэжысёра і пазнейшая рэабілітацыя яго імя.

Роля і месца творчасці Ф. Ждановіча ў гісторыі нацыянальнага тэатральнага мастацтва XX ст.

*Творчая дзейнасць Беларускага трэцяга дзяржаўнага тэатра пад кіраўніцтвам Ул.І. Галубка*

Гады вучобы Ул. Галубка. Пачатак дзейнасці Беларускага трэцяга дзяржаўнага тэатра спектаклем "Суд" Галубка. Рэпертуар трупы. Творчая дзейнасць Ул. Галубка як рэжысёра, акцёра, мастака і музыканта-афарміцеля спектакляў. Лепшыя акцёрскія работы Галубка. Склад трупы.

Асаблівасці тэатральных паказаў у перыяд "вандраванняў". Абнаўленне складу трупы. Спектаклі ІІ паловы 1920-х гг. Удзел у асобных пастаноўках тэатра рэжысёраў Е. Міровіча, Ф. Ждановіча, У. Крыловіча і інш.

Пастаноўкі БДТ-3 у 1930-я гг. Адхіленне Галубка ад кіраўніцтва тэатра. Спектаклі па творах рускай і замежнай класікі. Расфарміраванне тэатра, рэпрэсіраванне Галубка і рэабілітацыя яго імя.

Роля творчай дзейнасці Беларускага трэцяга дзяржаўнага тэатра ў айчыннай мастацкай культуры першай паловы XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Творчая дзейнасць М.А. Міцкевіча.*

Пачатак працы на сцэне ў якасці акцёра Першага беларускага таварыства драмы і камедыі Ф. Ждановіча. Вучоба ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве. Праца ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа. Лепшыя акцёрскія работы гэтага перыяду. Праца на Украіне. Фарміраванне рэжысёрскага стылю М. Міцкевіча. Лепшыя спектаклі Міцкевіча-рэжысёра.

*Творчая дзейнасць Л.М. Літвінава*

Пачатак творчага шляху. Пастаноўка масавых дзействаў. Вучоба на курсах у Маскве і праца на чале Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра Беларусі. Дакупалаўскі перыяд творчасці рэжысёра. Праца ў якасці галоўнага рэжысёра і мастацкага кіраўніка, а пазней рэжысёра-пастаноўшчыка ў тэатры імя Я. Купалы у Мінску. Лепшыя рэжысёрскія работы Л. Літвінава. Удзел у тэатральных дыскусіях і выступленне ў друку з артыкуламі па праблемах тэатральнага мастацтва. Праца галоўным рэжысёрам ў Казанскім рускім драматычным тэатры.

*Творчая дзейнасць І.С. Папова*

Вучоба ў тэатральным вучылішчы ў Архангельску і Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве. Праца ў расійскіх тэатрах. Прыезд у Беларусь і праца ў якасці рэжысёра у рускім драматычным тэатры, тэатрах Брэста, Гродна, Віцебска, Гомеля, Мінска. Рэжысёрскі стыль І. Папова. Найбольш значныя спектаклі і розных гарадах Беларусі і ў Мінскім ТЮГу. Праца І. Папова над інсцэніроўкамі паводле твораў З. Бядулі, С. Грахоўскага, І. Мележа. Узначальванне І.С. Паповым кафедры рэжысуры і майстэрства акцёра і праца выкладчыкам у Мінскім інстытуце культуры.

*Творчая дзейнасць Б.У. Эрына*

Вучоба ў тэатральным вучылішчы імя М. Шчэпкіна і Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага. Праца ў якасці рэжысёра і галоўнага рэжысёра тэатра імя Я. Купалы, Кіеўскага рускага драматычнага тэатра імя Лесі Украінкі. Пастаноўкі Б. Эрына ў тэатры імя Я. Купалы, рэспубліканскім ТЮГу, у тэатры імя Я. Коласа. Лепшыя спектаклі Эрына-рэжысёра і вызначальныя рысы яго рэжысуры.

*Творчая дзейнасць В.М. Раеўскага*

Вучоба ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Праца рэжысёрам, галоўным рэжысёрам і мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Педагагічная дзейнасць Раеўскага ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Лепшыя спектаклі Раеўскага-рэжысёра. Асаблівасці рэжысёрскай творчасці В. Раеўскага. Праца ў якасці рэжысёра-пастаноўчыка ў тэатрах розных краін. Апошні перыяд творчай дзейнасці В.М. Раеўскага.

*Творчая дзейнасць Б.І. Луцэнкі*

